**Дзіцячыя бібліятэкі ў 2002 г.:**

*Н.М.Касілава*

Сетка публічных бібліятэк Міністэрства культуры ўключае 270 спецыялізаваных дзіцячых бібліятэк. У параўнанні з 2001 г. колькасць дзіцячых бібліятэк паменшылася на адну адзінку. Гомельская вобласць па-ранейшаму захоўвае самую вялікую ў рэспубліцы сетку, якая ўключае 54 бібліятэкі. На дзве скарацілася колькасць бібліятэк, якія выкарыстоўваюць пазастацыянарныя формы. У 2002 г. 52 бібліятэкі вялі абслугоўванне насельніцтва сваіх зон праз 115 пунктаў выдачы.

Як і ў папярэднія гады, матэрыяльная база дзіцячых бібліятэк, іх аснашчанасць сучаснымі тэхнічнымі сродкамі яшчэ не набылі адпаведных узроўню і тэмпу. За год з 26 да 31 павялічылася колькасць бібліятэк, памяшканні якіх патрабуюць капітальнага рамонту, найбольш такіх бібліятэк у Гомельскай вобласці. Там колькасць іх узрасла з 7 да 13. Не змянілася сітуацыя ў Брэсцкай вобласці, дзе чатыры бібліятэкі, як і ў папярэдні год, патрабавалі капітальнага рамонту, у т.л. Пінская ГДБ, Кобрынская, Ляхавіцкая, Брэсцкая РДБ, у Магілёве – ДБ № 9. Пагоршылася сітуацыя ў Гродзенскай вобласці, дзе адна бібліятэка знаходзілася ў аварыйным стане і на адну павялічылася колькасць бібліятэк, якія падлягаюць капітальнаму рамонту. Незадавальняючы стан памяшканняў мелі тры бібліятэкі цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска і дзве ў Мінскай вобласці – Салігорская ГДБ і ДБ *“Верасок”* г. Маладзечна. У той жа час у шэрагу бібліятэк рэспублікі сітуацыя палепшылася: у Бярозаўскай і Жабінкаўскай РДБ Брэсцкай вобласці прайшлі бягучыя рамонты. Пасля капітальнага рамонту адкрылася ДБ № 14 г.Мінска, новую мэблю для чытальнай залы набыла Чачэрская РДБ Магілёўскай вобласці і г.д.

Для многіх дзіцячых бібліятэк камп’ютэры, мультымедыйная тэхніка па-ранейшаму заставаліся марай. Відэаапаратурай былі аснашчаны толькі чатыры бібліятэкі Брэсцкай вобласці і сродкі на набыццё камп’ютэраў і праграмнага забеспячэння ў 2003 г. увогуле не выдзяляліся. А, напрыклад, па Гродзенскай вобласці на гэтыя мэты сродкі былі атрыманы толькі для Навагрудскай РЦБС.

Паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы могуць паспрыяць спецыяльна распрацаваны для дзіцячых бібліятэк мінімум тэхнічнага аснашчэння, а таксама прызнанне прыярытэту дзіцячых бібліятэк пры размеркаванні тэхнічных сродкаў.

У 2002 г. працягвалася скарачэнне асноўных рэсурсаў бібліятэкі – бібліятэчнага фонду і новых паступленняў. Бібліятэчны фонд, які складае 7718,2 экз., за год паменшыўся на 36,1 тыс. экз., нягледзячы на тое, што па бібліятэках Гомельскай вобласці і г. Мінска назіралася павелічэнне фондаў. Недахоп сродкаў на новыя паступленні падштурхоўваў бібліятэкі да актыўнага пошуку пазабюджэтных крыніц фінансавання камплектавання пазастацыянарнага. Так, за сродкі спонсараў свае фонды папоўнілі бібліятэкі

Столінскай і Драгічынскай РЦБС Брэсцкай вобласці, Лельчыцкая РДБ Гомельскай і шэраг іншых бібліятэк.

Адбылося не толькі скарачэнне аб'ёму фондаў, але і яго рэпертуару. Асабліва абмежаваны рэпертуар паступленняў у сельскія і невялікія бібліятэкі. Сітуацыю маглі б палепшыць CD-ROMы, якія па кошту хаця і набліжаюцца да кошту добра выдадзенай кнігі, але, у адрозненне ад яе, утрымліваюць значна больш інфармацыйных адзінак. Стрымлівае іх набыццё не толькі абмежаванасць фінансавых сродкаў, але і адсутнасць у большасці дзіцячых бібліятэк камп'ютэраў. У структуры фондаў CD-ROMы складаюць яшчэ самую нязначную частку. Нават у такой бібліятэцы, як ЦГДБ г. Мінска, што вылучаецца высокай ступенню камп'ютэрызацыі, на іх долю прыпадае толькі 0,01%. Але колькасць CD-ROMаў у фондзе бібліятэкі штогод узрастае: у параўнанні з 1998 г. у 1,5 разы.

У новых паступленнях працягвалася павелічэнне долі перыёдыкі. Так, перыядычныя выданні ў новых паступленнях гарадской дзіцячай бібліятэкі г. Барысава складаюць 67%. Між тым сітуацыя з падпіскай складваецца не вельмі суцяшальная. Так, у дзіцячыя бібліятэкі Дзяржынскай ЦБС Мінскай вобласці на 2002 г. было выпісана 9 назваў газет па аднаму экзэмпляру. У 2001 г. рэпертуар быў прадстаўлены ўжо чатырма назвамі і 64 экзэмплярамі. За год колькасць экзэмпляраў часопісаў на адну бібліятэку паменшылася з 7-мі да 4-х, да аднаго экзэмпляра скарацілася падпіска на часопіс *"Бярозка"*, не была аформлена падпіска на *"Вясёлку"*. Маладзечанская РДБ Мінскай вобласці, як і Сенненская Віцебскай, была вымушана на другую палову 2002 г. удвая скараціць рэпертуар падпіскі, ГЦДБ г. Мінска ў другім паўгоддзі мінулага года не магла прадоўжыць падпіску на III–IV кв. на любімыя газеты і часопісы чытачоў: *"Зорька", "Раніца", "Родная прырода", "Вясёлка", "Клёпа", "Качели", "Знак вопроса"*. А Столінская РЦБС Брэсцкай вобласці зусім не аформіла падпіску.

На жаль, бібліятэкі не могуць у поўнай меры задаволіць чытацкі інтарэс дзяцей і падлеткаў і выпісваць неабходную колькасць часопісаў і газет. Аб тым, што гэты інтарэс значна шырэйшы, чым рэпертуар, які прапануецца бібліятэкамі, сведчаць вынікі даследавання, праведзенага ЦГДБ г. Мінска, згодна з якім у кола інтарэсаў чытачоў уваходзіць звыш 300 назваў перыядычных выданняў(беларускіх і расійскіх),у той час як бібліятэка выпісвае ўсяго 112 назваў. Тым больш, што попыт на перыядычныя выданні павялічваецца. Па бібліятэках сістэмы ён узрос з 22,5% у 2001 да 24,5% у 2002 г.

Пасля павелічэння колькасці карыстальнікаў бібліятэк, якое адбывалася ў папярэднія гады, пачалося яе амаль паўсюднае зніжэнне, акрамя г. Мінска: там лічба карыстальнікаў за год узрасла на 5,9 тыс. Адзначаецца памяншэнне групы чытачоў дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Па даных сталічных бібліятэк – на 3,3% за год (з 31% да 27,7%). У бібліятэках Гомельскай вобласці самую вялікую па колькасці групу чытачоў складаюць вучні 1–4-х класаў, на долю якіх прыходзіцца 33% ад агульнай колькасці, а самую меншую – дашкольнікі (6%) і вучні 9-х класаў (7%). Відавочна, што сучасная

дэмаграфічная сітуацыя не спрыяе росту чытацкай аўдыторыі ў дзіцячых бібліятэках, скарачэнне якой адбылося ў 2002 г. Суцяшае толькі, што яно пакуль нязначнае – усяго на 0,4 тыс.

У склад карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк, акрамя дзяцей да 15 гадоў, уваходзяць таксама бацькі, настаўнікі, вучні старэйшых класаў і навучэнцы гімназій, каледжаў. Найбольшая колькасць такіх чытачоў у бібліятэках г. Мінска, дзе іх працэнт (23%) ад агульнага аб'ёму карыстальнікаў самы высокі, у той час як па абласцях ён зніжаецца да 15% (Гомельская вобласць). Папулярнасць сталічных бібліятэк у данай катэгорыі мае і адваротны бок. Можна меркаваць, што ў гэтым выпадку яна выступае як індыкатар ступені насычанасці і размеркаванасці агульнай бібліятэчнай сеткі горада.

Для апошніх гадоў характэрна ўстойлівае скарачэнне аб'ёму сукупнага бібліятэчнага фонду, які за тры гады паменшыўся на 113,3 тыс. экз., прычым 67% ад гэтай колькасці прыходзіцца на справаздачны год. Гэта тэндэнцыя мела месца нягледзячы на павелічэнне фондаў, якое было адзначана ў бібліятэках Магілёўскай вобласці (на 23,9 тыс. экз.), і ўсяго на 1,3 тыс. экз. у Мінскай. Працэс выкліканы перш за ўсё памяншэннем аб'ёмаў новых паступленняў. Хаця іх агульная колькасць знізілася ўсяго на 9,1 тыс. экз., па рэгіянальных сістэмах лічбы скарачэння значна большыя. Так, у бібліятэкі г. Мінска паступіла на 16,7 тыс. экз. менш чым у папярэднім годзе, у Гомельскай вобласці – на 7,1 тыс. экз., Гродзенскай – на 6,9 тыс. экз. У Магілёўскай вобласці скарачэнне новых паступленняў адносна 2001 г. адбылося ў 14-ці з 19-ці раённых дзіцячых бібліятэках, прычым найбольш значна ў 6-ці бібліятэках. Толькі адна дзіцячая бібліятэка Светлагорскай РЦБС Гомельскай вобласці папоўніла свае фонды новымі паступленнямі, а Лельчыцкай РДБ два гады запар іх не атрымлівала. Адпаведна паменшыліся паступленні на адну бібліятэку, напрыклад, на 1 ЦДБ Гродзенскай вобласці паступіла ў сярэднім 250 экз. супраць 450 экз. у 2001 г. У Барысаўскую РДБ Мінскай вобласці ў мінулым годзе паступіла толькі 180 экз. літаратуры. У разліку на 1 карыстальніка новыя паступленні ў 2002 г. склалі ў сярэднім па рэспубліцы 0,39 кнігі супраць 0,41 у 2001 г. Найбольшая колькасць паступленняў (0,59) на чытача адзначана ў бібліятэках Гомельскай вобласці, найменшая (0,28) – філіялах ЦСДБ г. Мінска. Па асобных бібліятэках паступленні на аднаго чытача былі яшчэ меншымі. Так, у Маладзечанскай РДБ Мінскай вобласці прыходзіцца ўсяго 0,06 кнігі на чытача.

Чытальнасць як паказчык актуальнасці фонду, яго адпаведнасці чытацкім запытам у 2002 г. складала 22 адзінкі, што на 0,2 больш, чым у папярэднім годзе. Стабільнай (1,7) на працягу некалькіх гадоў застаецца абарачальнасць.

У арганізацыі работы з чытачамі і ўвогуле з дзіцячым насельніцтвам бібліятэкі праявілі свой сапраўды невычэрпны патэнцыял, шукалі і знаходзілі падыходы і ракурсы, якія раней не выкарыстоўваліся, мадыфікавалі традыцыйныя і мадэліравалі новыя формы работы. Бібліятэкі распрацоўвалі праграмы самай рознай тэматычнай накіраванасці. Найбольш пільная ўвага надавалася арыентацыі падрастаючага пакалення на духоўныя і агульначалавечыя каштоўнасці, прыродаахоўнае мысленне і паводзіны,

фарміраванню патрыятычных пачуццяў, распаўсюджванню краязнаўчых, эстэтычных ведаў, арганізацыі вольнага часу дзяцей, неад'емнай часткай якога з'яўляецца чытанне і кніга.

2002 г. стаў завяршальным годам у рабоце бібліятэк па рэспубліканскай мэтавай праграме *"Жизнь нуждается в милосердии"*, у межах якой быў абвешчаны агляд-конкурс "*Бібліятэка дзецям. Бібліятэка для дзяцей".* Асаблівую актыўнасць праявілі работнікі бібліятэк невялікіх населеных пунктаў. Журы конкурсу атрымала 126 праграм ад 116 бібліятэк рэспублікі, у тым ліку 19 сельскіх. Большасць заяўленых праектаў (41) былі прысвечаны арганізацыі вольнага часу, 25 – фарміраванню маральна-духоўных каштоўнасцей падрастаючай асобы, 19 – эстэтычнаму развіццю дзяцей і столькі ж– рабоце з дзецьмі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, 10 – адраджэнню традыцыі і падтрымцы сямейнага чытання, 8 – патрыятычнаму выхаванню. Пераможцамі і прызёрамі конкурсу сталі 24 бібліятэкі.

Сярод дзіцячых бібліятэк распаўсюджвалася практыка распрацоўкі і рэалізацыі ўласных праграм. У ліку іх можна нагадаць праграму дзіцячага аддзела Бабруйскай ЦРБ *"Крок насустрач*", якую бібліятэкі горада і раёна рэалізуюць з 1999 г. і для якой 2002 г. стаў завяршальным. Праграму складаюць тры падпраграмы – *"Дом", "Дар", "Прававой поезд".* Мэта падпраграмы *"Дом"*, назва якой складаецца з першых літараў словаспалучэння дзіцячы ордэн міласэрнасці, – работа з дзецьмі Чарнобыля, дзецьмі-інвалідамі, сіротамі. Падпраграма *"Дар"* накіравана на выяўленне і падтрымку талентаў і здольнасцей дзяцей; Падпраграма *"Прававой поезд"* – на работу з дзецьмі групы рызыкі, што стаяць на ўліку ў ІСН, сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. У рамках падпраграмы *"Дом"* бібліятэка ўдзельнічала ў арганізацыі і правядзенні дабрачынных калядных ранішнікаў для дзяцей-інвалідаў "*Нам Рождество приносит прелесть детской ёлки", "Радуга надежды*", дабрачыннай акцыі "*Падорым свята дзецям*". Супрацоўнікі бібліятэкі сумесна з бібліятэкарам Міхалеўскай сельскай бібліятэкі арганізоўвалі з выхавальнікамі дзіцячага дома цікавыя мерапрыемствы, гульні, віктарыны. Праграма ДАР рэалізоўвалася праз актыўную работу з бацькамі і дзецьмі: праводзіліся тэсціраванні і анкетаванні дзяцей і іх бацькоў па выяўленні схільнасцей і інтарэсаў дзяцей, ладзіліся адкрытыя прагляды літаратуры "*200 кніг, якія мы раім прачытаць*", па прадметах школьнай праграмы складаліся інфармацыйныя блокі "*Лішніх ведаў не бывае*", праводзіліся турніры інтэлектуалаў, конкурсы творчых работ. Праграму *"Прававой поезд"* склалі: міні-дыспут *"Чаму пераходны ўзрост называюць складаным?"*, адкрыты марафон для старшакласнікаў *"Ці лёгка быць маладым?*", час даверлівай размовы "*Знай правы, але не забывай пра абавязкі*", прэс-канферэнцыя "*Ребенок и семья*", конкурсная праграма "*Шерлок Холмс и другие".* Акрамя таго, бібліятэка ў час школьных тыдняў прававой прафілактыкі праводзіла з чытачамі алімпіяды па прававых ведах, дні ведаў для бацькоў і дзяцей. У ліку бібліятэк, што працавалі па асабістых мэтавых праграмах, таксама дзіцячая гарадская бібліятэка г. Гомеля № 5, якая ў 2002 г. пачала рэалізоўваць для навучэнцаў школы-інтэрната № 3 развіваючую праграму *"И это всё в библиотеке"*, разлічаную на

тры гады; Бешанковіцкая і Лёзненская РДБ Віцебскай вобласці – праграмы *"Міласэрнасць і бібліятэка", "Ад гісторыі роднага краю да адраджэння нацыянальнай культуры",* "*Экаазбука*"; ГДБ № 1 г. Бабруйска Магілёўскай вобласці – праграмай "*Міласэрнасць"*; Чэрвеньская РДБ – *"Дапамажы сабе вучыцца"* і Маладзечанская ГЦБС Мінскай вобласці – *"Крыніца духоўнасці".* За праграму Жодзінскай ГДБ *"Наш дом – Природа",* якая складаецца з падпраграм *"Павуцінка", "Цвецік-сяміцвецік", "Папараць-кветка"*, бібліятэка была адзначана грашовай прэміяй і Ганаровай граматай Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У 2002 г. бібліятэкі Гомельскай ГЦБС прыступілі да рэалізацыі комплекснай праграмы работы бібліятэк з дзецьмі і падлеткамі *"Читающий ребенок"*, разлічанай на тры гады і г.д.

Дзіцячыя бібліятэкі традыцыйна актыўна ўдзельнічаюць у штогадовым конкурсе БФК і МК *"Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"*. У 2002 г. грашовымі прэміямі і граматамі БФК за перамогу ў 11-м рэспубліканскім конкурсе былі адзначаны дзве дзіцячыя бібліятэкі – № 6 г. Мінска і Стаўбцоўская ДБ Мінскай вобласці. Граматамі адзначаны таксама Пінская гарадская ДБ імя Я.Коласа Брэсцкай, Сенненская РДБ Віцебскай і Чэрвеньская РДБ Мінскай абласцей.

Мінулы год, які па рашэнню ЮНЕСКА быў абвешчаны Міжнародным годам Я.Купалы і Я.Коласа, літаральна для кожнай бібліятэкі прайшоў пад знакам юбілеяў песняроў беларускага народа. Адбыліся юбілейныя Коласаўскія і Купалаўскія чытанні, у якіх актыўны ўдзел бралі дзіцячыя бібліятэкі, праводзіліся вечарыны, літаратурна-музычныя гадзіны, конкурсы чытальнікаў. Да прыкладу, бібліятэкі ЦБС Мінскай вобласці наладзілі літаратурную вечарыну "*Жыві, народ свабоднае краіны! Квітней ты, беларуская зямля",* Нясвіжская, Валожынская РДБ – дзень ведаў "*Уладар народных дум і песень*", Мядзельская РДБ – конкурс удумлівага чытача, вынікі якога былі падведзены на літаратурнай вечарыне "*А песня засталася, а песня будзе жыць!"*, Маладзечанская РДБ – музычную гадзіну *"Явар і каліна"* па творах Я.Купалы і Я.Коласа, а таксама прэзентацыю факсімільных выданняў "*Другое чытанне для дзетак беларусаў*" і *"Спадчына".* Казлоўшчынская ДБ Дзятлаўскай РЦБС Гродзенскай вобласці правяла літаратурны рынг, прысвечаны творчасці Я.Купалы "*Беларускай паэзіі волат*", дзе спаборнічалі ў чытанні вершаў і выкананні песень на словы паэта каманды хлопчыкаў – *"Арляняты*" і дзяўчынак – "*Купалінка*". Свята "*Як многа гавораць імёны такія*" правяла Мастоўская раённая дзіцячая бібліятэка, ранішнік па творчасці Я.Коласа – Воранаўская . Паэтычны калейдаскоп па вершах Я.Купалы і Я.Коласа адбыўся ў ДБ № 6 г. Гомеля. Рэчыцкая РДБ Гомельскай вобласці і гарадскія бібліятэкі г. Гродна ўдзельнічалі ў Купалаўскім літаратурным тыдні, а ЦГДБ г. Пінска – Коласаўскім, у межах якога арганізавала свята "*Якуба песні – дзіўны сэрца дар"*. Цэнтральная бібліятэка г. Мінска правяла вечарыну "*Летапісцы жыцця народнага",* на якой гучалі вершы, песні на словы паэтаў, былі пастаўлены сцэны з драмы Я.Купалы *"Раскіданае гняздо"*, Кобрынская РДБ Брэсцкай вобласці прысвяціла творчасці песняроў пасяджэнне клуба *"Светач"*, а

Драгічынская РДБ – літаратурны ранішнік *"Я.Купала і Я.Колас – дзецям"*. Святкаванні юбілеяў Я.Коласа і Я.Купалы папоўнілі скарбонку вопыту работы дзіцячых бібліятэк з творамі беларускіх класікаў.

Развіваўся патрыятычны напрамак работы, які ўсё больш бібліятэк вызначае ў сваёй дзейнасці як асноўны. Сярод іх бібліятэкі Брэсцкай вобласці – Іванаўская, Маларыцкая, Жабінкаўская, Камянецкая, Ляхавіцкая РДБ, дзіцячая бібліятэка г. Барысава Мінскай вобласці, а таксама бібліятэкі, адзначаныя ў намінацыі "*За патрыятычнае выхаванне*" на конкурсе "*Бібліятэка дзецям. Бібліятэка для дзяцей*" – Ганцавіцкая РДБ Брэсцкай вобласці (*першая прэмія*), Скідзельская сельская дзіцячая бібліятэка Гродзенскай РЦБС (*другая прэмія*), Курынская сельская бібліятэка Віцебскай РЦБС (*каштоўны падарунак*), бібліятэка СШ № 10 г. Брэста (*заахвочвальны прыз*). Дзіцячыя бібліятэкі як удзельніцы рэспубліканскай праграмы *"Патрыятычнае выхаванне"* праводзілі ўрокі мужнасці, часы гісторыі, абмеркаванні кніг пра Вялікую Айчынную вайну, арганізоўвалі сустрэчы з ветэранамі, расказвалі пра землякоў – абаронцаў Радзімы і шмат іншых мерапрыемстваў. У клубах пры бібліятэках прайшлі пасяджэнні, прысвечаныя Дню Перамогі. Гарадоцкая ДБ Віцебскай вобласці арганізавала ў бібліятэцы сустрэчу з разведчыцай партызанскага атрада А.А.Багданавай і сувязной Ф.С.Каратаевай. Дзіцячая група тэатра кнігі *"Зямляне"*, што створаны пры Гадзілавіцкай сельскай бібліятэцы Гомельскай вобласці, падрыхтавала для аднавяскоўцаў да Дня вязняў фашысцкіх канцлагераў паэтычны спектакль па творах П.Панчанкі, Я.Брыля, В.Вярбы, Н.Гілевіча.

Бібліятэкі найбольш пільную ўвагу звярталі на работу па фарміраванню маральных якасцей сваіх чытачоў, выкарыстоўваючы пры гэтым патэнцыял мастацкай, пазнавальнай літаратуры і жывога слова. З дзецьмі праводзіліся гутаркі аб агульначалавечых каштоўнасцях, маральных законах нашых продкаў, гучныя чытанні і абмеркаванні кніг, у якіх уздымаюцца пытанні маральных паводзін сучасных падлеткаў. У гэтай сувязі бібліятэкары звярнулі ўвагу на кнігі Я. Хвалея *"Пацукі"*, *"Прынцэса з тусоўкі"* і актыўна праводзілі іх абмеркаванні ў падлеткавай аўдыторыі. Многія работнікі дзіцячых бібліятэк лічаць, што менавіта гэтыя кнігі заслугоўваюць літаратурнай прэміі.

Усё смялей бібліятэкі праводзілі сярод дзяцей работу з кнігамі духоўнага характару і перш за ўсё з Біблія – кнігай, у якой выкладзены маральныя законы чалавецтва. Напрыклад, Бешанковіцкая РДБ Віцебскай вобласці правяла па ёй цыкл гучных чытанняў "*Кніга, адкрытая для ўсіх, – Біблія"*, актуальны дыялог "*Тайны хрысціянскіх сімвалаў"*; гадзіну ведаў *"Псалтыр – кніга духоўнасці"* – Свіслацкая РДБ Гродзенскай вобласці, гутаркі *"Ражство Прасвятой Багародзіцы"*, *"Прачыстая Прасвятая Багародзіца"* – Добрушская РДБ Гомельскай вобласці. Пры Людвіноўскай сельскай бібліятэцы Вілейскай РЦБС Мінскай вобласці дзейнічала студыя "*Санта Марыя*". Чытачы-студыйцы падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю "*Дзе сустракаецца неба з зямлёю*", разыгралі містэрыю "*На Каляды*", далі тэатралізаванае прадстаўленне "*Нарадзіўся – нам з'явіўся*". Неабходна адзначыць, што ядро бібліятэкі сучаснай духоўнай літаратуры для дзяцей яшчэ невялікае, не усё з таго, што

выдаецца і прысутнічае на кніжным рынку, бібліятэкі маюць магчымасць набыць. Таму шкада, што далёка не ўсе маюць у сваіх фондах кніжкі Г.Юдзіна *“Муромское чудо”*, кнігі маладой таленавітай расійскай пісьменніцы Н.Алеевай *“Алая птица”*, *“Герои русской истории”*, вершы А.Грыгор’евай, *“Библейские сказки”* С.Чорнага і інш.

Аматарскія аб’яднанні, клубы, гурткі заставаліся самымі распаўсюджанымі формамі арганізацыі работы з дзецьмі па інтарэсах. Працягвалі дзейнічаць раней створаныя клубы, такія як “*Кактус і К*” (Капыльская РДБ), “*Пунцовая кветачка*”, “*Экалогія”* (Нясвіжская РДБ), гасцёўня “*Натхненне”* (Клецкая РДБ), студыя “*Вернісаж”* (Слуцкая ГДБ), школа “*Падлетак: надзеі і трывогі*” (Салігорская ГДБ) Мінскай вобласці, *“Ева”* (Любчанская ДБ Навагрудскай РЦБС) Гродзенскай вобласці, а таксама шмат іншых. Чытачы Капыльскай, Лагойскай, Смалявіцкай, Заслаўскай РДБ Мінскай вобласці знайшлі сваё захапленне ў фланелеграфіі, праяўляюць неаслабную цікавасць да лялечных тэатраў, гурткоў. Нягледзячы на цяжкасці з набыццём лялек, дэкарацый бібліятэкары таксама вельмі зацікаўлена адносяцца да работы такіх аб’яднанняў. Мінулы год не быў выключэннем. Цікава і плённа працавалі лялечныя тэатры пры многіх бібліятэках усіх рэгіёнаў. Напрыклад, пры Драгічынскай, Маларыцкай, Жабінкаўскай, Івацэвіцкай РДБ, Баранавіцкай і Мінскай ЦГДБ Брэсцкай вобласці, а лялечны гурток *“Усмешка”* пры Ганцавіцкай РДБ пацвердзіў ганаровае званне *“Узорны”*.

Арганізацыя вольнага часу дзяцей – напрамак, які ўсё больш раскрываецца праз практычную работу бібліятэк па арганізацыі гурткоў і клубаў па інтарэсах. Іх колькасць не змяншаецца. Бібліятэкары ствараюць гурткі, у якіх дзеці займаюцца дэкаратыўна-прыкладной творчасцю: саломапляценнем, арыгамі, вырабам мяккай цацкі, макрамэ, лепкай і інш. Такія заняткі садзейнічаюць выпрацоўцы ў дзяцей дакладных рухаў, спрытнасці пальцаў, што спрыяе развіццю інтэлекту, а менавіта інтэлектуальнае развіццё сваіх чытачоў бібліятэкі вылучаюць як адну з мэт сваёй дзейнасці. Рудольф Штайнер, заснавальнік вальфсдорфскай педагогікі, філосаф, педагог, музыкант, быў упэўнены, што той, хто не здольны спрытна валодаць пальцамі, мае няспрытны інтэлект.

Шмат увагі надаюць бібліятэкі рабоце з дзецьмі ў час летніх канікул. Амаль усе бібліятэкі распрацоўваюць праграмы *“Лета і кніга”*. Да прыкладу, бібліятэкі г. Магілёва пачынаюць рэалізацыю агульнабібліятэчнай праграмы з прэзентацыі яе на гарадскім свяце дзяцінства. Бібліятэкары ў тэатралізаванай форме прадстаўляюць свае праграмы, наведваюць з імі школьныя летнія лагеры і адкрытыя пляцоўкі. Ва ўсіх бібліятэках адзін дзень у тыдзень адводзіцца для гульнятэк, у некаторых працуюць відэатэкі. Дзеці маюць магчымасць праглядаць мультфільмы. Па праграме *“Книжная радуга”* ў 2002 г. працавала дзіцячая бібліятэка № 2. 3 чэрвеня адбылася прэзентацыя праграмы “*Віват, канікулы*!”. На працягу двух месяцаў з чытачамі малодшых класаў праводзіліся конкурсы *“Літаратурнае апазнанне”, “Шчаслівы выпадак з героямі кніг”* і інш. У вызначаныя дні для дзяцей 5–6 кл. працавалі хобі-цэнтр, цэнтр гульні, прэс-цэнтр, інтэлектуальна-пазнавальны цэнтр. У жніўні адбыўся злёт

удзельнікаў праграмы. Гарадоцкая дзіцячая бібліятэка Віцебскай вобласці працавала на летняй пляцоўцы з дзецьмі, што адпачывалі ў аздараўленчым лагеры пры СШ № 1. Бібліятэкары арганізавалі для дзяцей літаратурнае лато, якое прысвячалася творам А.С.Пушкіна, *“Что за прелесть эти сказки”*, дэманстрацыю дыяфільма *“Детство А.С.Пушкіна”*, свята *“Путешествие на цветочную поляну”*, гульнёвую мазаіку *“Школа индейцев”*.

У дзейнасці бібліятэк вылучалася работа па ўсталяванню сувязей з грамадскасцю, па пошуку спонсараў. Бібліятэкі падтрымлівалі і развівалі на новым узроўні ўзаемаадносіны з традыцыйнымі партнёрамі, усталёўвалі сувязі з сацыяльнымі прытулкамі, нядзельнымі школамі, Таварыствам Чырвонага Крыжа і інш. Можна адзначыць, што бібліятэкі цалкам засвоілі сацыякультурную прастору рэгіёнаў і каапяруюць сваю работу з усімі ўстановамі, арганізацыямі, фондамі, аб’яднаннямі, якія займаюцца праблемамі дзяцінства. Спонсары выдзялялі бібліятэкам сродкі на набыццё кніг, прызоў для пераможцаў розных чытацкіх конкурсаў, арганізацыю і правядзенне ў бібліятэцы дзён нараджэння выхаванцаў дзіцячых дамоў і г.д.

Паспяховасці работы дзіцячых бібліятэк, росту прафесіяналізму работнікаў спрыяла дзейнасць метадычных цэнтраў па павышэнню кваліфікацыі. Праводзіліся семінары, практыкумы, на якіх разглядаліся актуальныя пытанні бібліятэчнай практыкі, абвяшчаліся агляды-конкурсы. Гродзенская АБ правяла абласны семінар загадчыкаў цэнтральных гарадскіх і гарпасялковых бібліятэк, на якім разглядаліся кірункі дзейнасці дзіцячых бібліятэк вобласці, Брэсцкая – семінар намеснікаў дырэктараў ЦБС *“Дзіцячая бібліятэка як цэнтр духоўнага і эстэтычнага развіцця дзяцей”*, ЦГДБ г. Мінска – навукова-тэарэтычны семінар “*Я.Купала і Я.Колас – заснавальнікі сучаснай беларускай літаратуры”*, Свіслацкая ЦРБ Гродзенскай вобласці – семінар “*Бібліятэка. Кніга. Сям’я. Работа бібліятэк з дзіцячым чытачом*”. Працавалі школы маладога бібліятэкара (Іўеўская, Воранаўская РДБ), школы прафесійнага майстэрства (Ашмянская РДБ Гродзенскай вобласці). Прайшло шмат конкурсаў, у тым ліку агляд-конкурс на лепшае юбілейнае мерапрыемства па творчасці Я.Коласа і Я.Купалы: бібліятэкі Столінскай і Бярозаўскай РЦБС Брэсцкай вобласці, Сенненскай РЦБС Віцебскай удзельнічалі ў конкурсе літаратурна-паэтычных груп з праграмамі, прысвечанымі песнярам і г.д.

Адбыліся змены у бібліятэчных кадрах. Натуральна, што скарачэнне сеткі адбілася на колькасці работнікаў дзіцячых бібліятэк у бок памяншэння (на 10 чалавек). Ад агульнай колькасці бібліятэчных работнікаў спецыялісты з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй складаюць 38% (у 2001 г. – 37,2%), але нягледзячы на колькасны рост гэта група спецыялістаў па-ранейшаму застаецца нешматлікай. У той час як у рэгіёнах, у прыватнасці, Магілёўскай вобласці, адбыўся яе рост на 1,1%. На высокім узроўні кадравае забеспячэнне спецыялістамі з вышэйшай бібліятэчнай адукацыяй у бібліятэках ЦСДБ г. Мінска, дзе на іх долю прыходзіцца 62,6%, а таксама Мінскай вобласці – 45%, а на самым нізкім – у бібліятэках Гомельскай, дзе такіх спецыялістаў у агульнай

колькасці бібліятэчных работнікаў толькі 19%. Увогуле ў кадравай структуры дзіцячых бібліятэк рэспублікі захоўвалася сітуацыя папярэдняга года.

У пераважнай большасці дзіцячыя бібліятэкі рэспублікі ўкамплектаваны спецыялістамі, якія валодаюць спецыфікай работы з дзецьмі, сучаснымі прыёмамі работы з кнігай, ведамі ў галіне псіхалогіі дзіцячага чытання, кнігавыдання для дзяцей і падлеткаў, дзіцячай літаратуры, дзякуючы чаму рэспубліка вылучаецца высокім узроўнем арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання дзіцячага насельніцтва.

## *Статыстычныя табліцы*

***Колькасць бібліятэк. Колькасць карыстальнікаў (тыс.чал.). Фонд (тыс. экз.).***

Табліца1

| Вобласць | Колькасць бібліятэк | | Змя-ненне | Колькасць карыстальнікаў | | Змя-ненне | Фонд | | Змя-ненне | Паступіла | | Змя-ненне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | |
| Брэсцкая | 36 | 36 | – | 77,3 | 76,3 | -1,0 | 999,1 | 997,8 | -1,3 | 22,9 | 21,6 | -1,3 |
| Віцебская | 44 | 44 | – | 106,5 | 105,6 | -0,9 | 1182,8 | 1177,7 | -5,1 | 34,1 | 32,7 | -1,4 |
| Гомельская | 55 | 54 | -1 | 91,6 | 89,8 | -1,8 | 1437,1 | 1451,2 | +14,6 | 60,9 | 53,8 | -7,1 |
| Гродзенская | 38 | 39 | – | 78,3 | 77,4 | -0,9 | 1002,1 | 1002,6 | +0,5 | 28,8 | 21,9 | -6,9 |
| Магілёўская | 39 | 39 | – | 91,8 | 90,5 | -1,3 | 1216,0 | 1197,0 | -19,0 | 29,4 | 52,4 | +23,0 |
| Мінская | 42 | 42 | – | 85,2 | 84,8 | -0,4 | 987,0 | 989,8 | +2,8 | 34,9 | 36,2 | +1,3 |
| г. Мінск | 16 | 16 | – | 81,7 | 87,6 | +5,9 | 930,2 | 902,1 | -28,1 | 39,4 | 22,7 | -16,7 |
| УСЯГО | 271 | 270 | -1 | 612,4 | 612,0 | -0,4 | 7754,3 | 7718,2 | -36,1 | 250,4 | 241,3 | -9,1 |

Табліца2

***Выдача*, *тыс. экз.***

| Вобласць | Выдана | | Змяненне | Чытальнасць | | Змяненне | Абарачальнасць | | Змяненне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | |
| Брэсцкая | 1657,6 | 1651,1 | -6,5 | 21,7 | 21,6 | -0,1 | 1,6 | 1,6 | – |
| Віцебская | 2545,2 | 2502,6 | -42,6 | 23,8 | 23,7 | -0,1 | 2,1 | 2,1 | – |
| Гомельская | 1972,4 | 1998,3 | +25,9 | 21,5 | 22,7 | +1,2 | 1,3 | 1,6 | 0,3 |
| Гродзенская | 1789,4 | 1792,2 | +2,8 | 22,8 | 23,1 | +0,3 | 1,7 | 1,8 | +0,1 |
| Магілёўская | 1922,9 | 1877,4 | -45,5 | 20,9 | 20,7 | -0,2 | 1,5 | 1,5 | – |
| Мінская | 1722,8 | 1739,8 | +17,0 | 20,2 | 20,5 | +0,3 | 1,7 | 1,7 | – |
| г. Мінск | 1783,0 | 1920,3 | +137,3 | 21,8 | 21,9 | +0,1 | 1,9 | 2,2 | +0,3 |
| УСЯГО | 13393,3 | 13481,7 | +88,4 | 21,8 | 22,0 | +0,2 | 1,73 | 1,76 | 0,03 |

табліца 3

### ***Кадры***

| Вобласці | Усяго работнікаў | | Змя-нен-не | У тым ліку | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | бібліятэчных работнікаў | | Змя-нен-не | з вышэйшай адукацыяй | | | | | | з сярэдняй бібліятэчнай | | |
| | 2001 | 2002 | | 2001 | 2002 | | усяго 2001 | усяго 2002 | Змя-нен-не | у т.л. з бібліятэчнай 2001 | у т.л. з бібліятэчнай 2002 | змя-нен-не | 2001 | 2002 | Змя-ненне |
| Брэсцкая | 200 | 194 | -6 | 153 | 151 | -2 | 75 | 70 | -5 | 55 | 56 | +1 | 67 | 71 | +4 |
| Віцебская | 256 | 252 | -4 | 207 | 204 | -3 | 93 | 92 | -1 | 64 | 69 | +5 | 96 | 96 | - |
| Гомельская | 248 | 250 | +2 | 189 | 190 | +1 | 65 | 67 | +2 | 37 | 36 | –1 | 103 | 100 | -3 |
| Гродзенская | 186 | 184 | -2 | 150 | 151 | +1 | 73 | 73 | - | 58 | 59 | +1 | 67 | 69 | +2 |
| Магілеёская | 226 | 215 | -11 | 175 | 169 | -6 | 66 | 64 | -2 | 58 | 57 | -1 | 108 | 103 | -5 |
| Мінская | 209 | 200 | -9 | 166 | 162 | -4 | 90 | 89 | -1 | 77 | 73 | -4 | 64 | 61 | -3 |
| г. Мінск | 234 | 252 | +18 | 163 | 166 | +3 | 124 | 128 | +4 | 99 | 104 | +5 | 31 | 31 | - |
| УСЯГО | 1559 | 1547 | +12 | 1203 | 1193 | -10 | 586 | 583 | -3 | 448 | 454 | +6 | 536 | 531 | -5 |